№ 1
Люты
2009 г.

# Народны кантроль

*Газета Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сіл*

## Народны кантроль у Магілёве

У Магілёўскай вобласці ў рамках абласной кааліцыі дэмакратычных сіл створаны камітэт пад назвай "Народны кантроль" па садзейнічанні ў барацьбе з карупцыяй.

Адзін з ініцыятараў стварэння камітэту, старшыня Магілёўскай абласной каліцыі дэмакратычных сіл Рыгор Кастусёў адзначае, што такая ідэя ўзнікла таму, што ў сродках масавай інфармацыі вельмі часта гаворыцца пра тое, што Магілёўская вобласць самая карумпаваная ў Беларусі. "Магчыма, так адбываецца, таму што вярхушка ўлады паходзіць з нашай вобласці і чыноўнікі на месцах лічаць, што ім усё дазволена".

Як паведаміў каардынатар Руху "За Свабоду" па Магілёўскай вобласці Віталь Васількоў, ініцыятыва на сёння ўжо падтрымана многімі грамадскімі і партыйнымі актывістамі вобласці.

Па словах Рыгора Кастусёва, "Народны кантроль" у выкрыцці выпадкаў карупцыі збіраецца супрацоўнічаць з



*Рыгор Кастусёў*

міліцыяй, КДБ, аблвыканкамам.

Заснавальнікі плануюць падаваць дакументы на рэгістрацыю камітэта як грамадскай арганізацыі.

## Могилевская область погрязла в коррупции и преступности?

Лукашенко обвинил КГБ в «сращивании с преступной средой»

— Давно мы не подходили к анализу работы областных структур КГБ. Наводить порядок в сфере правоохранительной деятельности следует повсеместно, и региональный уровень первичен в этих вопросах, - цитирует «Интерфакс» Лукашенко, который провел совещание в Могилевской области.

Президент с сожалением констатировал наличие фактов, свидетельствующих «о сращивании сотрудников правоохранительных органов Могилевской области с преступной средой».

В частности, по словам главы государства, сотрудники УКГБ по Могилевской области В.Готовчик и И.Радевич в числе других чиновников «оказывали противодействие правоохранительным органам в раскрытии преступной орга


*Александр Лукашенко*

низации, занимавшейся торговлей спиртным. По сути, крышевали подпольный бизнес». (Оконч. на ст. 2)

## Могилевская область погрязла в коррупции и преступности?

*(Окончание. Нач. на ст. 1)*

Лукашенко выразил обеспокоенность криминогенной ситуацией и состоянием борьбы с коррупцией в Могилевской области.

— Уровень преступности в регионе выше, чем в среднем по республике. Многие коррупционные преступления вскрываются запоздало, что нередко приводит к причинению на протяжении длительного времени ущерба в особо крупном размере. Позволяют чиновникам принять меры к сокрытию денежных средств, других материальных ценностей, добытых преступным путем либо легализовать их, — заявил президент.

***по материалам Интернета***

# МОГИЛЕВСКИЙ ЧИНОВНИК ОБВИНЯЕТСЯ ВО ВЗЯТОЧНИЧЕСТВЕ



Генеральная прокуратура завершила предварительное расследование и направила в суд уголовное дело по обвинению в получении взятки бывшего директора РУП «Могилевское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» А.Кулешова.

А.Кулешов обвиняется в том, что 28 августа 2008 года от представителя одного из коммерческих предприятий Российской Федерации получил взятку в сумме 45 тысяч долларов США, то есть, в особо крупном размере, за покупку на аукционе по заниженной стоимости бывшего административного здания Могилевского государственного финансово-экономического университета имени Ковалева. Действия А.Кулешова квалифицированы по части 3 статьи 430 УК Республики Беларусь.

А. Кулешов находится под стражей.

В целях обеспечения исполнения приговора в части возможной конфискации имущества, предусмотренной санкцией инкриминируемой статьи, на денежные средства А.Кулешова, счета в банках и иное имущество наложен арест на сумму около 170 миллионов рублей.

В Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь внесено представление об устранении установленных при производстве по делу нарушений закона, причин и условий, способствовавших совершению преступления.

***www.camarade.biz/***

## Что такое коррупция?

***Коррупция*** *- умышленное использование государственным должностным или приравненным к нему лицом либо иностранным должностным лицом своего служебного положения и связанных с ним возможностей, сопряженное с противоправным получением имущества или другой выгоды в виде услуги, покровительства, обещания преимущества для себя или для третьих лиц, а ровно подкуп государственного должностного или приравненного к нему лица либо иностранного должностного лица путем предоставления им имущества или другой выгоды в виде услуги, покровительства, обещания преимущества для них или для третьих лиц с тем, чтобы это государственное или должностное или приравненное к нему лицо либо иностранное должностное лицо совершили действия или воздержались от их совершения при исполнении своих служебных (трудовых) обязанностей.*

***Закон РБ «О борьбе с коррупцией»***

## Аб'ява

Да увагі грамадзян, якія маюць патрэбу ў юрыдычнай дапамозе ці кансультацыі.

Адрас грамадскай прыёмнай Рэспубліканскага ГА "Беларускі Хельсінскі Камітэт" і ГА "Магілёўскі Праваабарончы Цэнтр":

Магілёў 212001, завулак Крупскай, 5.

Тэлефон: 8-0296-316610

Электронны адрас: kravshenkomg@mail.ru

*Чуткі*

# Былы дэпутат Магілёўскага абласнога Савета па-ранейшаму “сядзіць”

Пасля таго як напярэдадні новага года, дзякуючы указу Аляксандра Лукашэнкі аб памілаванні, быў вызвалены з выпраўленчай калоніі былы старшыня канцэрна “Белнафтахім” ( і адначасова швагра яшчэ аднаго былога дэпутата ад Магілёўшчыны Уладзіміра Канаплёва) Аляксандр Бароўскі, **пайшлі чуткі пра вызваленне некаторых іншых VIP-сядзельцаў. Напрыклад, былога старшыні Белтэлерадыёкампаніі Ягора Рыбакова, які ў свой час узначальваў абласное тэлебачанне і быў дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета ад Бялыніцкага раёна.**

Нагадаю, што Вярхоўны суд Беларусі 27 сакавіка 2008 года прыгаварыў Бароўскога да 5 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыма (арыштавалі Бароўскага 29 траўня 2007 г.). Суд прызнаў былога кіраўніка “Белнафтахіму” вінаватым у злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі, якія прычынілі значную матэрыяльную шкоду (больш за адзін мільён дзвесці тысяч даляраў ЗША). Таксама Аляксандру Бароўскаму было забаронена занімаць адказныя пасады цягам 3 гадоў.

Але, як ужо даўно вядома, “свае” у нас доўга на нарах не затрымліваюцца (калі наогул туды трапляюць, аб чым сведчаць прыклады былога старшыні нацбанка Тамары Віннікавай і былога кіраўніка справамі прэзідэнта Галіны Жураўковай), таму Аляксандр Васільевіч ужо амаль два месяцы знаходзіцца на волі. Гэта калі калгаснік сцягне мех мукі альбо воз сена, дык будзе сядзець “ад званка да званка”...

Былога буйнога чыноўніка і дэпутата Магілёўскага аблсавета ад Бялыніцкага раёна Ягора Рыбакова судовая калегія па крымінальных справах Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь 11 студзеня 2005 года прыгаварыла к 11 гадам пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем права займаць адказныя пасады на 5 гадоў (за злоўжыванне службовым становішчам і атрыманне хабару). Згодна агучанай афіцыйнай інфармацыі, пракуратурай па справе Рыбакова было канфіскавана грашовых сродкаў на суму больш 500 тысяч даляраў ЗША. Таксама згодна рашэнню суда Рыбакоў павінен выплаціць на карысць Белтэлерадыёкампаніі больш за 212 мільёнаў рублёў і больш за 20 мільёнаў рублёў – у даход дзяржавы.

У апошні час пайшлі гуляць чуткі аб тым, што быццам бы Ягора Рыбакова са Шклоўскай выпраўленчай калоніі № 17 узмоцненага рэжыма перавялі на вольнае пасяленне.

Але ў Шклоўскай калоніі, дзе ён адбывае пакаранне за карупцыйнае злачынства, паведамілі, што Рыбакоў па-ранейшаму знаходзіцца там, піша *“Народная воля”*. Матэрыяльныя страты, нанесеныя дзяржаве, ён не пагасіў зусім. Разам з тым, кажуць у калоніі, Рыбакоў вылучаецца добрымі паводзінамі. Па словах супрацоўнікаў калонніі, Ягор Рыбакоў і там працягвае займацца любімай справай – робіць на



*Ягор Рыбакоў*

турэмным тэлебачанні перадачы пра “квітнеючую” Беларусь і яе мудрае кіраўніцтва. Магчыма, за гэтыя заслугі яму ў 2006 годзе “скінулі” два гады ад тэрміна пазбаўлення волі.

Што ж, дыма без агню не бывае, таму не вельмі здзіўлюся, калі ў бліжэйшы час Ягор Рыбакоў акажацца на волі і зойме кіруючую пасаду крыху больш нізкага ўзроўня. “Сваіх” улада не кідае...

**Іван Барысаў**

## Так и сказал. А. Г. Лукашенко:

«До чего же мы дойдем, если борьбой с коррупцией занимаются люди, которые сами попирают законы и нормы морали? Что можно ожидать от государственных органов, уполномоченных выполнять контрольные и надзорные функции, если их сотрудники принимают от проверяемых «откупные»?»

# Могилёвская область. Только факты

*За 11 месяцев 2008 года из 17 206 зарегистрированных в области преступлений, выявлено и поставлено на учет 333 коррупционных*, из которых: хищения путем злоупотребления служебными полномочиями – 90; легализация материальных ценностей, добытых преступным путем – 3; злоупотребление властью и служебными полномочиями – 17; бездействие должностного лица – 3; превышение власти и служебных полномочий – 2; служебный подлог – 125; получение взятки – 63; дача взятки – 22; получение незаконного вознаграждения – 6; бездействие власти – 2.

В структуре коррупционных преступлений наибольший удельный вес в 2008 году составил служебный подлог – 37,5 %, хищения путем злоупотребления служебными полномочиями – 27 %, все формы проявления взяточничества – 25,5 %, злоупотребления властью и служебными полномочиями – 5,1%.

Наибольшее количество коррупционных преступлений выявлено в сферах промышленности (88), торговли (67), сельского хозяйства (61), строительства (24), органах государственного управления (21).

Средний размер выявленных взяток составил 1500 долларов США.

Противоправными действиями должностных лиц при совершении коррупционных преступлений государству причинен ущерб на сумму 4,9 млрд. рублей, из которого возмещено 931 млн. рублей.

Судами области по рассмотренным в 2008 году 123 уголовным делам коррупционной направленности постановлены обвинительные при-



говоры в отношении 170 лиц и им назначено наказание: 37 – в виде лишения свободы, 52 – в виде ограничения свободы, 15 – исправительных работ, 66 – в виде штрафа в размере от 30 до 400 базовых величин. В качестве дополнительной меры наказания 79 лиц лишены права занимать организационно-распорядительные и административно-хозяйственные обязанности сроком от 1 года до 5 лет.

## Ці выяўлены карупцыйныя злачынствы на Бялыніччыне?

На пытанне адказвае начальнік Бялыніцкага РАУС, палкоўнік міліцыі Віталь Бізуноў:

- На працягу мінулага года на тэрыторыі нашага раёна супрацоўнікі групы па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі выявілі 8 карупцыйных злачынстваў у сферы эканомікі.

Напрыклад, прадавец аднаго з магазінаў райспа, дзеля сакрыцця недастачы таварна-матэрыяльных каштоўнасцей, унесла заведама несапраўдныя звесткі ў спіс пакупнікоў, якія атрымлівалі тавары ў крэдыт. Дзве пасадавыя асобы крухмальнага завода ў Бялынічах з мэтай сакрыцця недастачы абсталявання склалі заведама фіктыўныя дакументы на ўвод у эксплуатацыю абсталявання цэха. Начальнік вытворчасці таго ж бялыніцкага прадпрыемства грамадзянін Р. выкарыстоўваў даручанае яму абсталяванне не па прызначэнні, у сувязі з чым яно выйшла са строю і заводу прычынены матэрыяльны ўрон на 37826400 рублёў, што з’яўляецца буйным памерам.

Зараз следчым упраўленнем папярэдняга расследвання УУС аблвыканкама ўзбуджана і расследуецца крымінальная справа па частцы 4 артыкула 210 КК РБ – крадзёж шляхам злоўжывання службовым становішчам у асабліва буйным памеры – у адносінах да пасадавых асоб аднаго з таварыстваў раёна па факту набыцця аўтамашын па завышаных цэнах.

Народны кантроль
Газета Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сіл

Магілёўская абласная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Выдавец: Магілёўская абласная кааліцыя дэмакратычных сіл.

Бялыніцкі раён, в. В.Машчаніца. тэл. 37-110. Рэдактар Вырвіч Б.І. Наклад. 299 асобнікаў